# ЧАЛАВЕК І ПРЫРОДА БЕЛАРУСІ Ў КРАЯЗНАЎЧЫХ НАРЫСАХ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

**В. В. Навіцкая**

*Магістр філалогіі,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр-т Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь,*
*strahlbox@gmail.com*

У артыкуле вылучаны характэрныя вобразы прыроды Беларусі, створаныя ў краязнаўчых апавяданнях і нарысах Уладзіміра Караткевіча (1930 – 1984). Вызначаны сувязі прыродных і побытавых з'яў, па-мастацку адлюстраваных пісьменнікам, з беларускай этнапрасторай. Акрэслена роля этнічна маркіраваных дэталяў у жыцці беларуса ХХ стагоддзя.

***Ключавыя словы***: краязнаўства; беларуская проза; апавяданне-эсэ; нарыс-эсэ; вобразы прыроды; патрыятычны пафас.

# ЧЕЛОВЕК И ПРИРОДА БЕЛАРУСИ В КРАЕВЕДЧЕСКИХ ОЧЕРКАХ ВЛАДИМИРА КОРОТКЕВИЧА

**В. В. Навицкая**

*Магистр филологии,*
*Белорусский государственный университет,*
*пр-т Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь,*
*strahlbox@gmail.com*

В статье рассматриваются характерные образы белорусской природы, созданные в краеведческих рассказах и очерках Владимира Короткевича (1930 – 1984). Выявляются связи между природными и бытовыми явлениями, художественно запечатленными писателем, и белорусским этнопространством. Очерчена роль этнически маркированных деталей в жизни белоруса ХХ века.

***Ключевые слова***: краеведение; белорусская проза; рассказ-эссе; очерк-эссе; образы природы; патриотический пафос.

# MAN AND NATURE OF BELARUS IN THE LOCAL HISTORY ESSAY OF VLADIMIR KORATKEVICH

**V. V. Navitskaya**

*Master of Philology,*
*Belarusian State University,*
*4 Independence Ave., 220030, Minsk, Belarus,*
*strahlbox@gmail.com*

The article highlights characteristic images of Belarusian nature created in local history stories and essays by Uladzimir Karatkevich (1930 – 1984). The connections between natural and everyday phenomena, artistically depicted by the writer, and the Belarusian ethnospace are identified. The role of ethnically marked details in the life of a Belarusian in the 20th century is outlined.

***Keywords***: local history; Belarusian prose; story-essay; essay-essay; images of nature; patriotic pathos.

Уладзімір Караткевіч неаднаразова вяртаўся да той думкі, што прыродныя ўласцівасці беларускай зямлі рабілі моцны і выразны ўплыў на фарміраванне характару нашых прашчураў. Пацверджанні таму пісьменнік знаходзіў, звяртаючыся да падзей сівой мінуўшчыны, побытавых рэалій далёкіх часоў, у якіх вылучаў самабытныя асаблівасці характару продкаў. Як многія вершы 1950-х гадоў («Заяц варыць піва», «Як размаўляюць звяры і птушкі», «Ялінка», «Лісце», «Алень», «Бацькаўшчына», інш.), так і раннія апавяданні («Клён», «Лясная гісторыя») гавораць пра імкненне маладога Караткевіча ўвабраць у сваю душу дзівосны свет беларускай прыроды, адчуць энергію рэчак, дыханне магутных дрэў, зразумець размову звяроў і птушак, іх дыялогі «на дзясятках і тысячах розных моў» [1, с. 77]. Ён лічыць важнейшай задачай дя сябе вось гэта: «Зберагаць годнае і вялікае старое. Ствараць годнае і вялікае новае. Толькі годнае. Толькі вялікае» [2, с. 392].

У перапісцы 1950-х – 1960-х гг. з А. А. Назарэўскім, А. І. Бялецкім, выкладчыкамі-філолагамі Кіеўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Тараса Шаўчэнкі, якім бязмерна давяраў і якіх глыбока паважаў, У. Караткевіч акрэсліваў свае погляды і творчыя планы. Звяртае на сябе ўвагу ліст Уладзіміра Караткевіча да Аляксандра Іванавіча Бялецкага ад 26 жніўня 1956 года. Нагадаем наступны, вельмі паказальны, фрагмент гэтага ліста: «Жадён я, вот что нехорошо, за всё бы хватался, если б не давали по лапам. Написать бы вот ещё книгу путевых заметок. Пешком исходить всю Белоруссию и потом в книге, непременно с фотографиями, описать леса,

людей, зверей, народные танцы, фольклор, старые здания, легенды. Здесь же дать стихи, собственные рассуждения, статистические сведения, сравнения с тем, что было (из старых книг), смешные случаи в дороге – в общем, этакий лиро-эпический винегрет для людей, которые хотели бы знать, где они живут. Причём написать так, чтобы человеку хотелось немедленно взять палку в руки и отправиться в Троки, чтоб лунной ночью на острове посреди озера побыть наедине с развалинами замка Гедимина, или пробираться на душегубке по полесским “межитокам”. И я это когда-нибудь непременно сделаю» [3, с. 430]. Безумоўна, падобнай энергіяй намераў ды абвостранасцю пачуццяў былі выкліканы і рэзкія рэплікі У. Караткевіча на словы А. І. Бялецкага, абуранага неразумнымі адносінамі ў краіне да прыроды. І лесу найперш. У адказе на ліст выкладчыка яго былы студэнт-беларус выкажа сваё разуменне праблемы. Выкажа з болем і абурэннем: «Палают деревья, мелеют реки, смерчи срывают крыши и ломают сады. И за книги об этом присуждают звания лауреатов, хотя автору несомненно был бы приятнее жесткий закон о лесах, запрещение рубить их где бы то ни было, кроме немеряной Сибири, да и то на научной основе. Честное слово, иногда жалеешь о петровских виселицах вокруг дубров» [3, с. 462]. Тут малады У. Караткевіч мае на ўвазе лесаахоўныя законы Пятра І, якія забаранялі пад страхам смерці рубіць лес, што ішоў на будаўніцтва царскага расійскага флоту.

Багацейшай інфармацыяй пра гісторыю лясных нетраў Беларусі прыцягвае ўвагу раздзел «Зялёны шум» з кнігі нарысаў-эсэ У. Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі». Разумееш, што ў сваіх вандроўках па нечапаных пушчах – Бярэзінскай, Лепячанскай, Гродзенскай, Налібоцкай, Белавежскай – ён не быў бесклапотным турыстам. Усё фіксавала яго ўчэпістае вока. Адсюль і дакладная характарыстыка «царства лясоў», у якім «прапісаны» дарослыя і маладзенькія дрэвы і дрэўцы, вопытныя патрыярхі і шматсотвяковыя сведкі прадаўніх часоў і падзей. Не праміне паказаць, як раскашуюцца ля ног веліканаў падлеткавы падлесак, густыя кустарнікі, травы. Прымусіць услухацца ў асцярожную, вельмі суцішаную плыннасць лясных ручаёў і рачулак, засяроджаных на тым, каб не патрывожыць спакой волатаў. Рухнуўшы, яны маглі загарадзіць шлях водным лясным артэрыям. Давялося б кружляць, ісці ў абход, ладкуючы новае рэчышча. У караткевічаўскім царстве лясоў усё жывое, рэальнае, са сваімі клопатамі і адчуваннямі.

У аточанай лесам вёсцы Данілегі (або Данілевічы), дзе давялося пабываць пісьменніку, яго ўразіла аблічча старой жанчыны: ён назваў яе прывітаннем з сярэдніх вякоў «у сваім з ног да галавы напеўным народным уборы» [2, с. 77]. Захоплены дасканаласцю жаночага строю,

У. Караткевіч адзначыць унікальнае майстэрства вышыўкі: снежна-белая сарочка аздоблена такім арнаментам, за якім вопыт і густ многіх пакаленняў. Такому вучылі тысячагоддзі. І вышываная хустка, і шнуроўка, і тканы андарак прыглушаных колераў – усё чаравала дзівосным спалучэннем. Да ўсяго дужа пасавалі чабоцікі з каляровай скуры. Убачанае было незвычайна прыгожым і мудрым: «І я зразумеў, што ў вобразе гэтай старой, сярод гэтых лясоў, пад гэтым беларускім небам, упершыню ў маім нябедным жыцці, сустрэлася мне сама Гармонія» [2, с. 78]. Яшчэ адзін цуд: тут паўсюль вячэрняй парой гучалі песні. Нечакана ўзнікла важная думка: «У гэтай вяскова-лясной цішыні і абсалютнай Гармоніі старамоднымі, дысгарманічнымі былі яны, інтэлігенты дваццатага стагоддзя» [2, с. 78]. Не рашыліся яны, запрошаныя гасціннымі гаспадарамі на ноч у хату, парушыць бялютка-музейнае хараство гэтай хаты з дзівоснымі ручнікамі, з вясёлкавымі посцілкамі і вышыванымі падушкамі. Спалі на сене.

Сярод эсэістычных твораў У. Караткевіча пра свет беларускіх лясоў (не менш дзівосны, чым зямля Прыморскага запаведніка ў яго ж аповесці «Чазенія») асаблівае месца займае нарыс-эсэ «Сцюдзёная вясна, або Тысяча год і сем дзён» (1980). Твор багаты ідэйна-філасофскім зместам, ліра-публіцыстычнай эмацыянальнвсцю, эпічнай аб’ёмнасцю, канкрэтыкай рэальнага жыцця і навукова-гістарычнай дакладнасцю. Першыя старонкі эсэ наводзяць на думку, што перад табою па-мастацку выкладзеныя дарожныя ўражанні і гістарычна-філасофскія разважанні пра той край, пра тую старажытную зямлю, куды вяла мэта творчай камандзіроўкі. Патрэбна было сабраць цікавы матэрыял, каб годна прывітаць Тысячагоддзе славутага ў далёкія часы сваёй навукай, дзяржаўнасцю Турава. Аўтар адразу прапануе чытачу пачуць «голас з васьмі стагоддзяў», двойчы працытаваўшы ўрывак са «Слова…» Кірылы Тураўскага з нагоды Вялікадня на старабеларускай мове і ў перакладзе на сучасную. У той далёкі вясновы дзень святар бласлаўляў абуджэнне вясны, магутную сілу новага жыцця. Тураў жа, у якім група журналістаў і пісьменнікаў планавала правесці сем дзён камандзіроўкі, сустрэў зусім не гасціннай вясной: «Мабыць, адной са сцюдзёных, стылых і непрытульных вёснаў, якія даводзілася перажываць гораду» [2, с. 390]. Тая вясновая непрытульнасць паўплывала, безумоўна, на агульную танальнасць твора. Дождж, холад, рэдкія праблескі сонца, якім не давяраюць мудрыя дубы, золкая зямля, нізкае хмарнае неба… Усё засцерагала аўтара ад фанфарна-святочнай эйфарыі.

Пісьменніку неабходна было вырашыць няпростую нават для яго задачу. Даравіты гістарычны раманіст мусіў па-мастацку ўганараваць

знаны ў свеце ў эпоху тураўскага «Златавуста» горад, які «ні па дзяржаўнасці, ні па асвечанасці не саступаў Полацку, Ноўгараду Вялікаму, Кіеву…» [2, с. 391]. Творца, дасведчаны ў гістарычнай, навукова-культурнай значнасці старажытнай сталіцы Тураўскай зямлі, выкажа ў адрас сучаснага горада сваё катэгарычнае меркаванне. Адным сказам. На цэлы абзац: «Тураву хопіць пакуль што тысячы год і славы Кірылы Тураўскага» [2, с. 390].

Акрэсліўшы мінулае Турава, У. Караткевіч займальна і акуратна ладкуе кампазіцыйны строй эсэістычнага цэлага. Умела злучаецца высокае мінулае і дынамічнае жыццё сучаснай Тураўшчыны. Па меры набліжэння да Жыткавіч у аўтобусе ўсё часцей мяняюцца пасажыры. Становяцца «галаснейшыя галасы» і ўсё больш рызыкоўнымі жарты. Аўтар захоплена спыняецца на такіх вось дарожна-аўтобусных сітуацыях: у салон мяккага аўтобуса «на правах поўных гаспадароў увальваюцца <…> крыклівыя цёткі з мяхамі крапівы», і вясёлы дзядок, і бабка з малым унукам, захутаная галоўка якога нагадвала капусны качан. Аказваецца, у час гульні ў касманаўты яму надзелі «шлем» – чыгун, зняць які самастойна не атрымалася. Едуць па дапамогу да спецыялістаў. Пісьменнік выдатна адчувае смехавую культуру народа. Ацэніць і смешна-дзіўнаваты выгляд, можа, будучага героя космасу, і «звычайны дарожны беларускі перабрэх» [2, с. 391]. Падобныя сцэны выклікаюць не толькі ўсмешку апаведача, але і трывожны роздум над праблемамі нашай будучыні. Няхай шчасна жывецца ў часе, калі ў небе лётаюць спрадвечныя лебедзі і мужныя касманаўты. І ўсё ж непакоіць думка: каб не зваліся лебедзі, каб не знікла жывая аздоба зямлі і неба, «трэба яшчэ многа гаварыць і гаварыць. Мала таго, працаваць над гэтым і працаваць, змагацца за гэта і змагацца» [2, с. 392].

Дарожныя ўражанні ад каларытнага аблічча пасажыраў, мясцовых вяскоўцаў, па прыездзе ў Тураў дапаўняюцца асаблівай цікавасцю пісьменніка да сапраўдных знаўцаў усіх таямніц Прыпяцкага запаведніка. Адзін з іх – арнітолаг Вадзім Пятровіч Клакоцкі. Знешне падобны на У. І. Даля. Істотны штрых. Дом арнітолага і прыняў сталічных гасцей. Тут пісьменніку «было дабрэй за ўсё». Учэпістае вока празаіка не абмінае нічога з таго, чым была запоўнена прастора прыватнага жыцця чалавека, з якім давядзецца мераць шляхі да запаведнай дубровы. Па ўсім відаць, што В. Клакоцкі – руплівы гаспадар. І хата, і двор у квецені, і пабудовы для насельнікаў двара, «вартых упамінання», гавораць пра яго клопатныя адносіны да абавязкаў як у запаведніку, так і на ўласным падворку. Знайшлося ў гэтай характарыстыцы месца і дабітаму на лясных сцяжынах матацыклу:

нялёгкая ў іх з гаспадаром служба на запаведнай Тураўскай зямлі. І хоць яна таксама Палессе, але мясцовыя жыхары не лічаць сябе палешукамі: «Тут былі і ёсць «туроўцы». Ды і характар «туроўца» падаўся занадта ўпэўненым у сабе. Вераць «туроўцы», што заняпад іх былой славы часовы. Уражанне дапоўніць сустрэча з дырэктарам Прыпяцкага ландшафтна-гідралагічнага запаведніка Ільёй Аляксандравічам Салановічам, які адчуваў, што будучыня гэтых мясцін і самога гарадка <…> менавіта ў запаведнасці гэтай зямлі. Разумеў, што «гэта ўнікальная навукова-доследная пляцоўка, якіх у Еўропе – і не толькі ў Еўропе – ужо амаль няма» [Тут і ніжэй вылучана мною. – В. Н.; 2, с. 398].

Прыпяцка-тураўскую рэальнасць У. Караткевіч падае з уласцівай яму, ліра-эпіку, канкрэтыкай, прымушаючы актыўна працаваць пабытавыя дэталі. Часам з добрым гумарам, а часам звыкла іранізуючы. Адкрыццём для творцы стала не толькі прыроднае першародства запаведніка, але і арнітолаг В. Клакоцкі. Ехаць з ім было цікава і пазнавальна: бачыў многае, бо ў яго быў «зрок, абвостраны веданнем <…> Я магу сказаць: “Кражныя пайшлі” ды, можа, дабаўлю, што самцы. А ён скажа, што ляцяць на ліньку. Я заўважу двух сівагракаў, а ён скажа, па якой такой справе і куды яны кіруюцца» [2, с. 401]. Апроч усяго, В. Клакоцкі, адчуваючы талент спадарожніка слухаць удумліва і справу гаварыць, дзеліцца трывожнымі думкамі пра папуляцыю гарнастаяў, што знікла ў мясцовасці Ковек, пра ваду з канавы Бычок, якую нельга піць, і пра чысценькую дуброву, якую пасадзілі вельмі даўно. Балюча бачыць яму, як тут, пад дубамі, пасвіцца статак і ўсюды каровіны праснакі: буферная зона толькі на словах існуе.

Далей аб’ектам размовы становіцца спрадвечная дуброва і яе адносіны да стылай вясны, якая прывяла сюды творчага чалавека. І ён прадстаўляе не асобныя дрэвы-волаты, а вялікую лясную сям’ю. Усе яе члены рознаўзроставыя, таму і найменне яе гучыць па-рознаму: дуброва, дуброўка, дубровачка. Жыве гэтая сям’я па сваіх векавечных правілах. Не спяшаюцца дубы і дубочкі даверам вітаць першыя праблiскі вясновага цяпла: «Хто іх ведае, ці будзе яна, гэтая цеплыня. Кніжкі кніжкамі, прагнозы па радыё прагнозамі. Першых мы не чытаем, другіх не слухаем і слухаць не хочам. Мы слухаем сваіх бацькоў. Вунь той, малады яшчэ, два стагоддзі. А як было яму трыццаць шэсць – выпаў у чэрвені снег на чвэрць сажня, а ў ліпені азёры пакрыліся лёдам, а лістота на ім счарнела. А вунь той – зусім смаркач – нейкія сто год. Дык у ягоным юнацтве здарыўся год – жыта жалі ў кажухах. Сонца сонцам, а пажывём – пабачым» [2, с. 401 – 402]. Падобныя звесткі пра кліматычныя метамарфозы мінулых стагоддзяў не плён аўтарскай фантазіі, а веды, дабытыя з гістарычных хронік, летапісаў, мемуарнай літаратуры.

«Дзіва лесу» пачыналася там, дзе была правільна знойдзена вадзяная жыла. Якраз там раскашавалі дубы, клёны, ясені, грабы, вольхі. І, вядома, дубы-волаты. «І цяплей тут, не так адчуваецца стыласць вясны, і ласкавей тут, і паветра тут іншае» [2, с. 402]. У параўнанні з полем. Метафарычна сцверджана думка, што толькі лес – лёгкія зямлі, лёгкія чалавека, а поле, ніва – страўнік.

У тым лясным падарожжы да спрадвечнай дубровы не хапала яшчэ аднаго праваднікa – палясоўшчыка Уладзіміра Георгіевіча Кадоліча, якому дужа пасавала мясцовая мянушка «кароль лесу». Прафесійная самавітасць «караля лесу» абумовіла і адпаведную сінтаксічную арганізацыю пісьма: як у біблейскіх тэкстах або старажытных летапісах. Падзейная дынаміка, рух часу выяўляюцца праз аднатыпнасць сінтаксічных утварэнняў-паўтораў – злучнік і плюс дзеяслоў: «І селі мы ў машыну, і паехалі мы да палясоўшчыка <…>, і прывезлі яго дахаты, і чакалі…» [2, с. 403]. Як сапраўдны гаспадар лесу У. Кадоліч ведае, калі трэба зрэзаць сухі дуб, і, шкадуючы буслоў, пасняшацца наладзіць ім новае жыллё. Адным абзацава-самастойным сказам скажа эсэіст пра значнасць асобы «караля лесу»: «Жывы яшчэ пакуль лес беларускі вось такімі людзьмі» [2, с. 404]. Дзякуючы У. Кадолічу, аўтару адкрылася сапраўднае дзіва. Неапісальнае. Гэта былі пойменныя дубы. «Дубы, якія перанеслі вечнасць, дубы, якія кожнай часцінкай сваёй былі як адмаўленне сцюдзёнай вясны і сцвярджэнне цеплыні і сонца» [2, с. 404]. Узнікла неверагоднае адчуванне вечнасці. На фізічным узроўні апаведачу стала не па сабе. Стала кепска, бо рэальна не можа дапамагчы вечнасці. Захацелася самотнай адзіноты, каб не задыхнуцца ад пачуццяў і думак. І ад незвычайнай аздобы зямлі, якая была ўся ў ландышах: «Ландыш каля ландыша, гэта не перабольшанне. На адным дэцыметры не менш чым дзесяць – пятнаццаць раслін. І так наколькі вока сягае» [2, с. 494]. Гэтыя ландышы не для гандляроў, не для рублёў. Яны патрэбны, каб сэрца не страціла шчырасць, каб гэтае дзіва прымусіла сучасніка ў век неверагодных хуткасцей перапыніць свой бег, падумаць пра сваё быццё ў рэальным часе на фоне такога красавання эямлі. Прачытаеш такое і ўспомняцца словы кінарэжысёра Юрыя Цвяткова, з якім сябраваў У. Караткевіч: «Рамантык у жыцці, ён быў глыбокім рэалістам у творчасці» [5, с. 503].

Як бачна, эсэ У. Караткевіча «Сцюдзёная вясна, або Тысяча год і сем дзён» – твор шматпраблемны.

Патрыятычны пафас, арганічна ўласцівы цэламу жыццю У. Караткевіча, надзвычай яскрава выявіўся ў разгледжанай прозе пра прыроднае багацце Беларусі: дакументальна-мастацкіх нарысах-эсэ «Зялёны шум» (раздзел з краязнаўчай кнігі «Зямля пад белымі крыламі»,

1972) і «Сцюдзёная вясна, або Тысяча год і сем дзён» (1980). Трывожна, аголена, з вялікай сілай мастацкай вобразнасці вызначаны ў гэтых творах, а таксама ў эпісталярнай спадчыне У. Караткевіча (лістах да А. І. Бялецкага, А. А. Назарэўскага) не толькі этнакультурныя адметнасці нацыі, але і многія лёсаносныя пытанні блізкай і аддаленай будучыні беларускага грамадства.

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Караткевіч У.* Збор твораў: у 25 т. / У. Караткевіч; прадм., падрыхт. тэкстаў і камент. А. Вераб'я; рэд. тома В. Рагойша. Мінск: Маст літ., 2012. Т. 1: Паэзія: 1950. – 1960. 533 с.

2. *Караткевіч У.* Збор твораў: у 25 т. / У. Караткевіч; падрыхт. тэкстаў П. Жаўняровіча; рэд. тома В. Іўчанкаў. Мінск: Маст. літ., 2016. Т.12: Публіцыстыка. Эсэ-нарысы: 1952 – 1982. 494 с.

3. *Караткевіч У.* Збор твораў: у 25 т. / У. Караткевіч: падрыхт. тэкстаў, камент. А. Вераб'я, Г. Кажамякіна; рэд. тома А. Бельскі. Мінск: Маст. літ., 2020. Т.19: Лісты. Частка І. 606 с.

4. *Караткевіч У.* Збор твораў: у 25 т. / У. Караткевіч: падрыхт. тэкстаў, камент. Я. Будовіч [і інш.]; рэд. тома А. Бельскі. Мінск: Маст. літ., 2022. Т. 20: Лісты: Частка 2. 367 с.

5. *Цвяткоў Ю.* Праз гісторыю – да сучаснасці // Уладзімір Караткевіч. Быў. Ёсць. Буду! : успаміны, інтэрв'ю, эсэ / уклад. Г. Шаблінскай. Мінск: Маст літ., 2005. С. 498 – 503.